БАРАЦЬБІТЫ ЗА НАРОДНУЮ СПРАВУ

# ЛЕНІНСКАГА ГАРТУ

Уладзімір Ільіч быў цяжка хворы, і ўрачы забаранілі яму прымаць наведвальнікаў. Але ён не мог не працаваць. Як толькі хвароба крыху адступала, Уладзімір Ільіч выклікаў стэнаграфістку і пачынаў дыктаваць. Упарта, настойліва, быццам баючыся, што не паспее выказаць партыі, народу самае важнае, самае галоўнае.

У адзін з такіх дзён Надзежда Канстанцінаўна паведаміла Ільічу, што яго хоча бачыць Старшыня ЦВК БССР Чарвякоў. У. І. Ленін добра ведаў гэтага энергічнага, валявога работніка, які многа зрабіў для станаўлення Савецкай улады ў Беларусі. У маі 1920 года па яго асабістаму даручэнню Аляксандр Грыгор'евіч займаўся падрыхтоўкай дывізій, перакідваемых з Усходняга фронту на барацьбу супраць белапалякаў, арганізаваў парад войск, якія адпраўляліся на польскі фронт. На гэтым парадзе Уладзімір Ільіч выступіў перад чырвонаармейцамі з палымянай, натхнёнай прамовай. І цяпер, амаль праз тры гады, напоўненыя цяжкай барацьбой за сацыялістычныя пераўтварэнні ў краіне, Леніну захацелася абавязкова сустрэцца з прадстаўніком беларускага народа.

А. Г. Чарвякоў з хваляваннем пераступіў парог пакоя. Ён убачыў беласнежную пасцель і на ёй Ільіча. Аляксандр Грыгор'евіч добра ведаў, што Ленін ніколі не прымаў наведвальніка, не падняўшыся з-за стала яму насустрач. Цяпер у яго сціснулася сэрца. Але Ленін усміхаўся, працягваў руку.

— Рады вас бачыць, дарагі, — сказаў ён. — Сядайце, расказвайце. Хаця не, спачатку дазвольце падзякаваць у вашай асобе ўсім беларусам. Калі б не ваша збожжа, вельмі туга прыйшлося б некаторым гарадам Цэнтральнай Расіі, асабліва Саратаўскай губерні і Чувашыі. Дзякуй. Перадайце дзякуй ад мяне асабіста і ад усяго Савецкага ўрада. Цяпер слухаю вас...

Чарвякоў прысунуўся разам з крэслам бліжэй да ложка і павёў расказ аб справах, якія яго хвалявалі і дзеля якіх ён прыехаў з Мінска ў Маскву — да Леніна. У той час у краіне пачалося ажыццяўленне ленінскага кааператыўнага плана. Па сутнасці тады рабіліся толькі першыя крокі ў пераводзе вёскі на сацыялістычныя рэйкі. І, натуральна, дзе-нідзе на месцах, у тым ліку і ў Беларусі, няправільна разумелі новую палітыку, дапускалі перагібы. Аб гэтых цяжкасцях Аляксандр Грыгор'евіч і расказаў Ільічу. Ён прывёў пераканаўчыя прыклады. У дадатак папрасіў дзесятак трактараў для рэспублікі.

Ленін слухаў уважліва, зрэдку ўстаўляючы адно-два словы, а калі Аляксандр Грыгор'евіч расказваў аб цікавых эпізодах, весела смяяўся. Уладзімір Ільіч з адабрэннем адзначыў першыя поспехі кааперацыі, падтрымаў пазіцыю Чарвякова ў гэтым пытанні.

Задушэўная гутарка зацягвалася. Аб гэтым нагадвала



А. Г. Чарвякоў.

неаднаразовае з'яўленне ў пакоі Надзежды Канстанцінаўны Крупскай. І субяседнікам нічога іншага не заставалася, як развітацца.

— Ну добра, — згадзіўся пад папракаючым поглядам жонкі Уладзімір Ільіч. — Толькі, Надзя, напішы Арджанікідзе, што я прашу выдзеліць Беларускай рэспубліцы трактары. Дзесяць, вядома, не атрымаецца, але па магчымасці больш.

Паціскаючы на развітанне Чарвякову руку, ён летуценна дадаў: «Прыйдзе час — Беларусь сваімі трактарамі будзе забяспечваць усю краіну».

Сустрэча з правадыром запомнілася Аляксандру Грыгор'евічу на ўсё жыццё. Многае з таго, што раней здавалася незразумелым, заблытаным, цяпер стала простым і зразумелым. Глыбокая перакананасць Уладзіміра Ільіча ў поспеху пачатай справы перадалася і яму. І неяк міжвольна ўспомніліся пражытыя гады, пройдзены нялёгкі і складаны жыццёвы шлях.

Нарадзіўся Аляксандр Грыгор'евіч 8 сакавіка 1892 года ў сялянскай сям'і ў Дукорскай воласці Мінскай губерні. Рана зведаў нястачы і бачыў несправядлівасць існаваўшага памешчыцка-капіталістычнага ладу. У сям'і часта гаварылі аб горкім лёсе яго дзеда, які быў прыгонным ткачом у памешчыка, цягнуў лямку няволі. Адмена прыгоннага права не прынесла гэтаму беднаму чалавеку палёгкі. Ён атрымаў усяго тры дзесяціны зямлі на трох сыноў. Вось чаму бацька Сашы вымушан быў у маладосці таксама працаваць у памешчыка. Потым яму «пашанцавала». Крыху навучыўшыся пісьменнасці, ён пайшоў шукаць сваёй долі ў горад і ўладкаваўся на работу канторскім служачым.

Бацька стараўся ўсімі сіламі вывесці сына «ў людзі». Як ні цяжка было, але ён уладкаваў хлопчыка спачатку ў царкоўна-прыходскую школу, а затым у гарадское вучылішча. Аляксандр вучыўся выдатна, лічыўся першым вучнем. У той жа час ён, як мог, стараўся дапамагчы бацьку. З чатырнаццаці гадоў сам здабываў сродкі на жыццё і вучэнне пабочнымі ўрокамі, перапіскай і іншымі паслугамі.

Яшчэ будучы ў гарадскім вучылішчы, юнак цвёрда рашыў аддаць усе сілы служэнню прыгнечанаму народу, аб жыцці якога так многа чуў і


А. ЦІТОЎ,
навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ.



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы